УДК 821.161.3-4

**Т. С. Нуждзіна**

# «ТОЛЬКІ КУЛЬТУРА ПРАЦУЕ НА ДУХ»: ЭСЭІСТЫЧНЫ ДОСВЕД ЯНКІ СІПАКОВА

*Артыкул прысвечаны даследаванню асаблівасцей мастацкага ўвасаблення Сіпаковым-эсэістам духоўна-маральнага аблічча пісьменнікаў «філалагічнага» пакалення, эстэтычныя густы і культура творчага мыслення якога фарміравалася пад уздзеяннем літаратурна-мастацкіх набыткаў знакавых у нацыянальнай і сусветнай прасторы постацей.*



МГПУ им. И.П. Шамякина

Актыўнае функцыянаванне ў беларускай літаратурна-творчай прасторы XXI стагоддзя выдатнай эсэістыкі – з’ява не толькі відавочная, але і заканамерная. Сведчанне гэтаму – мастацкі вопыт Янкі Сіпакова на шляху асваення ім прынцыпаў эсэістычнага пісьма. У гутарцы з З. Прыгодзічам пісьменнік прызнаўся, што ў рэчышчы аўтабіяграфічнай прозы пачаў працаваць з 1974 года, апрабоўваючы розныя жанры – запісы, мініяцюры, роздум. Пазней, сабраўшы падобны матэрыял пад адной вокладкай, абазначыць па-свойму, як гэта ўласціва толькі яму, Сіпакову, і жанравую прыроду кнігі: «Гэта своеасаблівы дзённнік. Не звычайны нататнік, у які запісваюцца кожны дзень думкі і разважанні, а апасродкаваны водгук на тое, што адбывалася ўчора і тысячы гадоў назад. Гэта дзённік душы. Ці нават – жыцця. Я ж сам яго называю дзённікам настрою» [1, 183].

У дыялогу з Л. Рублеўскай пісьменнік заклапочана гаварыў пра такія глабальна важныя і нязменныя мэты сучаснай і будучай літаратуры свету, як «вывучаць і даследаваць словам, пачуццём чалавека і свет, у якім ён жыве і ў якім мог бы жыць». Акрэсліць пры гэтым і першасную адметнасць («прыватнасць») беларускай літаратуры «як найпаўней выразіць, паказаць сваю зямлю, свой народ, яго душу, бо ніхто ў свеце лепей і дакладней за нас не зробіць. Каб свет, пазнаёміўшыся з нашай літаратурай, мог сказаць: “Дык вось якія яны, беларусы!”» [2, 66–67]. Вось гэтак захоплена марылася ў сярэдзіне 50-х гадоў XX стагоддзя і настаўніку-паэту У. Караткевічу, калі ў лістах да М. Танка дзяліўся сваімі творчымі намерамі адкрыць беларусу яго гістарычнае мінулае, дапамагчы яму спасцігнуць самога сябе і паказаць свету гістарычную самасць беларуса.

У артыкуле «Пра Янку Сіпакова ў самым агульным плане» (1996) паэт, навуковец Н. Гілевіч вызначыў у мастацкім характары пісьменніка наступнае: давер і павага да жыцця, любоў і дабрыня да чалавека, да людзей і нарэшце «давер і павага да самога сябе, да свайго таленту і густу. А гэта само не прыходзіць. Гэта здабыта вялікім жыццёвым і творчым вопытам» [3, 305–306]. Правамерным будзе падобнае меркаванне і ў дачыненні да таго, як, напрыклад, класіфікаваў свае мастацкія набыткі творца, рыхтуючы да выдання кнігу «Пяць струн»: так абазначаны пяць накірункаў рэалізацыі таленту, а яшчэ розныя рэгістры сэрцабіцця і кожны раз іншае пачуццё, новы эмацыянальны настрой.

Літаратурна-творчыя, эстэтычныя канцэпцыі Я. Сіпакоў падае ў інфармацыйных запісах з адпаведнымі каментарыямі, у роздумах, мініяцюрах, дыялогах-спрэчках з самім сабой, сюжэтных апісаннях сцэн, эпізодаў з літаратурнага жыцця. Пры гэтым так яднае свет сваіх думак, эмоцый, навуковых досведаў і каментарыяў у мастацкае цэлае, што ў большасці выпадкаў кнігі эсэістыкі Я. Сіпакова маюць кожны раз дадатковыя жанравыя ўдакладненні – дзённік настрою «Соты», гістарычны партрэт-эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля». Эсэ «Мая бібліятэка» – гэта



МГПУ им. И.П. Шамякина

кніга пра кнігі, а эсэ ў 2-м томе выбраных твораў аб'яднаны ў раздзел пад назвай «Пра што думалася на адзіноце». Прыгаданы раздзел – гэта калейдаскоп думак пра літаратуру, таямніцы таленту, пра душу творцы, пра штодзённае рашэнне глабальнай задачы «будзіць чалавека ў чалавеку» [4, 343]. А яшчэ пра абавязак кожнага, хто ўсвядоміў сябе пісьменнікам, працаваць са словам так, каб не быць аднастайным, пачуццёва бедным і безаблічным. За ўсім бачыцца імкненне аўтара «пісаць сэрцам», глыбока пранікаючы думкамі ў сутнасць чалавечага і прыроднага свету, ствараючы сваю філасофію быцця ў літаратуры, жыцця літаратурай. Ёсць, напрыклад, у эсэ «Наталенне смагі» абсалютна бясспрэчная думка, надзвычай актуальная для сённяшняй беларускай культурна-адукацыйнай рэальнасці: «Літаратура не стварае звыклых матэрыяльных каштоўнасцей, яна не вырошчвае хлеб, не будуе заводы, не робіць машын. Яна вырошчвае, будуе, робіць, стварае самую высокую і самую галоўную матэрыяльную каштоўнасць на зямлі – Чалавека» [4, 367]. І далей у сваіх прызнаннях аб тым, як адбываецца «наталенне смагі» тварыць, як і што ўплывае на фарміраванне духоўна-інтэлектуальнага аблічча асобы, на шляхі асваення маральна-этычных і эстэтычных вышыняў чалавекам ці пакаленнем, пэўным народам або сусветнай супольнасцю, Я. Сіпакоў якраз і наблізіцца да асноваўтваральнай ідэі будучага эсэ «Мая бібліятэка». Пакуль гэта ўсяго дакладна сфармуляваны тэзіс: «Кніга – гэта ж заўсёды роздум. Яна абавязкова змушае думаць. І я глыбока перакананы, што паўнацэнную, гарманічную асобу нельга выхаваць без кнігі, без літаратуры…» [4, 375]. У эсэ «Мая бібліятэка» менавіта Кніга стане персанажам, тоесным аўтару-эсэісту, і вызначальным маркерам усяго існага ў вобразным змесце і сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора.

Агульную карціну развіцця духоўна-інтэлектуальнага, эстэтычнага патэнцыялу беларускай творчай інтэлігенцыі канца 50 – пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя, у жыцці якой галоўнае месца яшчэ з часоў ваеннага ліхалецця ці пасляваеннай разрухі і голаду заняла Кніга, унікальна намаляваў у эсэ «Мая бібліятэка» Я. Сіпакоў. Твор мае характэрны падзагаловак – «Кніга пра кнігі». Гэта сапраўды таленавіта напісаная Кніга пра жыццё кніг у прасторы і часе, у жыцці асобнага чалавека і цэлага пакалення, названага «філалагічным». Гэтаму пакаленню выпаў лёс насуперак жыццёвым нягодам тварыць саміх сябе, спяліць у сваіх душах творчы пачатак, дбаючы не толькі пра асабістыя поспехі, але і пра літаратуру. Цікавыя думкі пра час станаўлення творчага аблічча свайго пакалення пакінуў Янка Сіпакоў, гэты надзвычай таленавіты, далікатна-сціплы прадстаўнік філалагічнага пакалення: «Мы ішлі ў літаратуру не па адным. Мы ўрываліся ў літаратуру ўсе разам – гуртам, выраем, моцнаю хваляю, усім пакаленнем. Нам так было зручней, цікавей, весялей, радасней. І чым больш было ў нас паплечнікаў, тым упэўненей мы сябе адчувалі: расце наша родная літаратура! Заўсёды думалі мы не толькі пра свае творы, але і пра літаратуру» [5, 77].

МГПУ им. И.П. Шамякина

І дзённік настрою «Соты», і партрэт Беларусі «Зялёны лісток на планеце Зямля» ў пэўнай ступені падрыхтавалі з'яўленне эсэ «Мая бібліятэка». І ў адным, і ў другім творы пісьменнік часта разважае пра кнігу, яе ролю і месца ў духоўным жыцці нацыі. Праўда, малюючы партрэт Беларусі (эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля»), аўтар стварае агульную мадэль светабыцця нацыі, таму і вылучаны ў якасці ключавога слова займеннік наш: «Нашы лясы», «Нашы песні», «Нашы дарогі», «Нашы замкі», «Нашы кнігі» і г. д. У эсэ «Мая бібліятэка» падкрэслены выразна суб'ектыўны пачатак. У першым выпадку аўтарскае «я» не з'яўляецца суцэльнай тэмай, у той час як эсэ «Мая бібліятэка» характарызуецца такімі адметнымі рысамі эсэістычнага пісьма, як здольнасць апавядальніка мысліць, разважаць, аналізаваць, суадносячы сваё аўтарскае «я» з характэрным для яго пакалення мастацкім бачаннем тагачаснай рэальнасці, таму і становіцца дамінантным у апавядальнай плыні эсэ займеннік мы. Якраз «уласнае мысленне, развага, роздум, аналітыка, здуменне, меркаванне, – на думку В. Акудовіча, – і з'яўляюцца вызначальнымі якасцямі канструктыўных элементаў структуры эсэ як жанру» [6, 6].

Эсэ «Мая бібліятэка» як унікальнае мастацкае палатно заснавана на абсалютна канкрэтнай аснове. Кожная кніжная паліца – цікавая размова аўтара з кнігамі, чытачамі, сябрамі, высокімі душамі вялікіх творцаў, талент якіх і сёння служыць усяму свету. Пісьменнік, па сутнасці, праводзіць свайго роду экскурсію ў святая святых – бібліятэку творцы, яго рабочы кабінет. Разам з тым – гэта далучэнне нас, сённяшніх, да духоўных скарбаў чалавецтва, да культуры ўспрымання сакрэтаў і таямніц стварэння мастацкай рэальнасці геніяльнымі творцамі. А яшчэ – гэта прачытанне на мяжы асабістай растворанасці, суперажывання трагічнасці жыццёвага лёсу чалавека, пазначанага боскім дарам тварыць.

Пры ўсёй разняволенасці аўтарскага аповеду (законы жанравай прыроды дыктуюць такі спосаб арганізацыі мастацкага цэлага) заўважаецца строгая падпарадкаванасць сюжэта самай значнай ідэі – данесці праўду пра шлях пісьменнікаў «філалагічнага» пакалення ў літаратуру.

Над усім, пра што ідзе размова – спавядальна-шчырая, развітальная, – чуецца душа ўлюбёнага ў Кнігу, у Мастацтва чалавека. Душа майстра, творцы, інтэлектуала. Па-мастацку таленавіта, з невымоўнай цеплынёй расказваецца эсэістам пра ахвярную наканаванасць жыць літаратурай, існаваць на хвалі вострай патрэбы тварыць найперш сябе як асобу, якой так шчодра адмерана выпрабаванняў – і жыццём, і талентам.

Кожны дыялог з кнігай, яе стваральнікам або іншым суразмоўцам выдае клопат пісьменніка найперш пра тое, каб не падацца каму нясціплым, амбіцыйным, недалікатным. Увогуле сціпласць Я. Сіпакова – з'ява фенаменальная. Нават перадача пісьменнікам сваёй унікальнай бібліятэкі ў дар роднай Аршаншчыне, здаецца, і па сёння не ацэнена шырокай грамадскасцю як праява вышэйшай духоўнасці стваральніка сагі



МГПУ им. И.П.Шамякина

пра яго старажытныя Зубрэвічы. Гэтая сціпласць заяўляе пра сябе і ў самой мастацкай структуры Кнігі пра кнігі, у філасофіі мыслення творцы, характары ўвасаблення дум і думак у сістэмнае цэлае. Вось і праравецца роздум-сумненне, адрасаванае самому сабе: «Стой, стой, стой, хлопча… Ну і разгаварыўся ж ты! Спыніся, дружа, агледзься. А то нанізваеш усё, як на нітачку: гэта кніга, а тады гэта, а потым вунь тая… Няма стройнасці і прадумасці сюжэта» Але праз хвіліну набягае зусім іншая думка, новае адчуванне: «Прабач, а чым гэта дрэнна? Можа, яно якраз і добра, што ўсё чапляецца? Можа, менавіта гэта і ёсць сюжэт? Натуральнасць аповеда. Нязмушаная ручаіна, плынь свядомасці» [7, 88].

Ведучы размову пра час, літаратурнае пакаленне, пра свае дачыненні з мастацкім вопытам геніяльных творчых постацей, пісьменнік трапляе ў залежнасць ад шматлікіх жыццёвых і літаратурных рэалій, што ажываюць у памяці. У эсэ «Мая бібліятэка» на асноўную мастацкую ідэю выдатна працуе з'ява, якую балгарскі вучоны М. Арнаўдаў абазначыў як феномен узаемадачыненняў успамінаў з працэсам творчасці: «Гэтая незвычайная даўгавечнасць уражанняў, атрыманых калісьці, іх асаблівасць з'ўляцца ў залежнасці ад розных прычын у ланцугу перад унутраным зрокам, разам з жывымі ўспамінамі пра перажытае, маюць істотнае значэнне для любога роду творчай дзейнасці» [8, 127]. Сапраўды, тое, што было калісьці асвоена Я. Сіпаковым на ўзроўні яго інтэлектуальна-псіхалагічнай сутнасці, гэтак значна абудзілася ў мастацкай свядомасці творцы ў эсэістычнай «Кнізе пра кнігі», прымусіўшы працаваць памяць, пачуцці, настрой, мысленне, бачанне, фантазію.

Эсэістычны аповед пісьменніка пра ўласную бібліятэку ўражвае асобым талентам гаварыць пра кнігі, лёс творцаў, іх трагічнае быццё і радасць самасцвярджэння з вышыні жыццёвага вопыту, інтэлектуальнай дасведчанасці, творчай сталасці. А яшчэ на мастацкую вартасць пісьменніцкага эсэ пра кнігі моцна паўплывала таленавітае засваенне беларускім майстрам сусветных традыцый мемуарна-эсэістычнага пісьма. Раскрываючы душу, псіхалогію свайго пакалення, на якое так паўплываў іх век, бо «гэта і сапраўды быў век кнігі» [7, 89], аўтар дакладнаназаве тыя пласты інтэлектуальна-мастацкай культуры народаў свету, якія дапамагалі маладым беларускім пісьменнікам вырывацца з нарматыўна-ідэалагічных інструкцый, указанняў пра што і як пісаць. Яны, дзеці вайны, уваходзілі ў мірнае жыццё з вялікай прагай вучыцца. І падлетак з аршанскіх Зубрэвіч не быў выключэннем. Яго шлях у краіну ведаў і творчасці якраз і стаў аб'ектыўным увасабленнем той суровай рэальнасці: «Тады была ва ўсім строгасць. І быў вялікі голад. Выключна на ўсё. І на кнігу – таксама» [7, 82]. Тая галодная на сапраўдную літаратуру рэальнасць адбілася ў мемуарна-бібліяграфічнай прозе Н. Гілевіча («Перажыўшы вайну», «Між роспаччу і надзеяй»), эпісталярнай спадчыне У. Караткевіча, дзённіках Е. Лось.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Нельга не сказаць і пра тое, што апошняе па часе свайго напісання эсэ Я. Сіпакова – гэта не проста «Кніга пра кнігі», а «жывая бібліятэка». Пісьменнік не толькі называе імёны або знакавыя для сусветнай культуры творы. Тут часта гучаць галасы саміх творцаў. Янка Сіпакоў цытуе з твораў С. Ясеніна або М. Гумілёва, Г. Ахматавай, М. Цвятаевай, Д. Мераждкоўскага, А. Белага, У. Маякоўскага, Б. Ахмадулінай, Я. Еўтушэнкі… Гучыць паэзія, проза. Згадваюцца лёсавызначальныя моманты з жыцця геніяльных творцаў – паэтаў, празаікаў, мастакоў, кампазітараў, скульптараў. Арганічна ў гэты хор галасоў, цытат, каментарыяў, ацэнак, характарыстык уключаюцца і меркаванні самога эсэіста. Яны бываюць аб'ёмныя і лаканічныя. Эмацыянальныя. І вельмі істотныя. У агульным гучанні галасоў, рытмаў, мелодый заўсёды дакладна, заўсёды трапляючы ў патрэбную ноту вядзе сваю партыю аўтар эсэ. Вось, напрыклад, падаецца цэлая абойма імёнаў – аж чатыры дзясяткі: ад Камю да Акутагавы. Пры гэтым адразу вызначаны характар дачыненняў з названымі творцамі – іх кнігі былі духоўнай патрэбаю, а не данінай модзе на кніжны бум. Аўтар даводзіць чытачу, што «ўсе яны, творцы і мудрацы розных часоў, эпох і народаў, зрабіліся для нас на той час нашымі сучаснікамі, і мы часам шмат каго з іх уяўлялі сваімі сябрамі. Мы абыходзіліся з імі, як са сваімі равеснікамі» [7, 90].

Кніжныя паліцы хатняй бібліятэкі Я. Сіпакова сабралі не толькі арыгінальныя творы пісьменнікаў розных шырот, розных мастацка-стылёвых школ, розных філасофскіх, светапоглядных сістэм. Знайшлі тут сваё месца і кнігі, якія дапамагалі пакаленню маладых літаратараў 60-х гадоў XX стагоддзя аб'ектыўна ўспрымаць поўныя драматызму жыццёвыя і творчыя шляхі-дарогі тых, хто калісьці зведаў шчаслівы і радасны або горкі, трагічны працэс здзяйснення свайго творчага «я». Гэта кнігі пісьменніцкіх біяграфій, што выдаваліся ў такіх серыях, як «ЖЗЛ», «Жыццё ў мастацтве», літаратурныя партрэты К. Чукоўскага, успаміны пра С. Ясеніна, яго родных і блізкіх, «Раман без хлусні» А. Марыенгофа, успаміны пра М. Цвятаеву яе сястры Анастасіі. Кнігі такога кшталту, як бачна, давалі адказы на многія пытанні, якія ўзнікалі ў беларускага пісьменніка па меры яго ўваходжання ў мастацкі свет таго альбо іншага вялікага творцы.

Трапляе ў поле зроку пісьменніка-кнігалюба і мемуарная трылогія А. Белага «На мяжы двух стагоддзяў», «Пачатак веку» і «Паміж дзвюх рэвалюцый». Спашлецца пры гэтым на думку даследчыкаў: трылогія – «лепшае, што напісана А. Белым пасля «Пецярбурга» [9, 62]. Імпануюць беларускаму эсэісту і тэарэтычныя высновы рускага пісьменніка адносна літаратурнай працы, мастацкай творчасці ўвогуле. Асабліва ўразіла канцэпцыя дачыненняў творцы са сваімі чытачамі, выкладзеная А. Белым у яго праблемных развагах «Як мы пішам» і «Пра сябе як пісьменніка». Ацэньваючы здольнасці чытача ўспрымаць мастацкі твор, мастацкі вобраз,

МГПУ им. И.П.Шамякина

мастацкую ідэю, А. Белы мысліў глабальна. Яго пазіцыя і сёння ўспрымаецца, – падкрэслівае сучасны эсэіст, – як першаступенная аснова літаратурнай адукацыі ў школе і ВНУ: «Цікавая думка: агульнадаступнасць для ўсіх друкаванага тэксту стварыла ілюзію яго лёгкага разумення. Пісьменны, умееш чытаць – і любая кніга адкрыта перад табою. Белы ж абвяргае гэтую думку, сцвярджаючы, што чытанне – не толькі напружанне зроку, але і намаганне ўнутранага слыху, псіхалагічнага настрою, мабілізацыя сіл і працы» [9, 62].

Эсэ «Мая бібліятэка» дае безліч дзівосна-таленавітых урокаў прачытання мастацкіх твораў. Урокаў разумення таго, як і калі западаюць у душу творцы дэталі, побытавыя рэаліі, жэсты, сітуацыі, якія пазней сталым майстрам афармяцца ў канкрэтную мастацкую рэальнасць, у якой жыў і тварыў рэальны майстар, абазначаны ў канкрэтным часе, канкрэтнай прасторы. Скажам, раманіста Пятра Бабарыкіна ведалі, бачылі, чулі многія, а вось данесці яго жывое аблічча, стварыць запамінальны славесны партрэт змог А. Белы. Змог так выяўна данесці жывасць натуры пісьменніка, каб выдатны літаратар XXI стагоддзя, надзелены тонкім мастацкім густам, у захапленні прамовіў: «Які жывапіс! Не, я не чытаў гэта, а бачыў! Я быў там, і на маіх вачах ператваралася ў арыгінальнага чалавека, у жывую субстанцыю гэтае ўцялесненае слова Белага» [9, 64].

Выхаванне культуры спасціжэння мастацкага твора немагчыма – перакананы Я. Сіпакоў – без сур’ёзнага знаёмства з мастацка-біяграфічнай, мемуарна-эсэістычнай літаратурай, з яе багатай фактвлагічнай асновай, гістарычнай канкрэтыкай, характарыстыкай асяроддзя, побыту, геаграфіі маршрутаў творчай асобы. Словам, гэта тыя веды, што даюць ключ да разумення прыроды таленту творцы, эмацыянальна-псіхалагічнай сутнасці, натуры пісьменніка, логікі яго мастацкага мыслення.

Багацце імёнаў, сістэмны характар адбору шэдэўраў сусветнай культуры, удумлівае, змястоўнае іх успрыняцце аўтарам эсэ і яго літаратурным акружэннем гаворыць і пра тое, наколькі быў самадастатковым працэс творчага станаўлення беларускай літаратурнай моладзі 60-х гадоў: «Аднак ужо маё пакаленне, – прызнаецца аўтар эсэ, – адкрывала для сябе і вялікую глыбу – цікавую амерыканскую літаратуру, сярод якой вяршыняю ўзвышаўся Эрнест Хэмінгуэй» [9, 49]. Так, дзякуючы творам пісьменнікаў і літаратуры пра іх, скажам, Парыж творчай маладосці Хэмінгуэя стаў Парыжам і беларускай літаратурнай моладзі. А яшчэ быў Парыж Г. Ахматавай, дзе яе юнацтва памятала мастака Мадзільяні. Нельга не сказаць пры гэтым пра інтэлектуальную дасведчанасць Я. Сіпакова – яна не ўкладваецца ў звыклыя межы. Пра ўсё з веданнем справы, грунтоўна, доказна. У развагах пра фотагенічнасць Ахматавай заўважыць, што яе любілі маляваць: «І на партрэтах яна атрымлівалася такая ж: элегантная, задумлівая, недасяжная, стройная, велічная, поўная годнасці» [9, 53]. Аднак з асаблівым пачуццём прыгадае



МГПУ им. И.П.Шамякина

той «светлы, як свята, томік выбранай паэзіі Ганны Андрэеўны», дзе «на ўсю светлую супервокладку – тая імклівая і лятучая лінія. Мадзільяні! Знакаміты партрэт Ганны Ахматавай! Усяго толькі росчырк пяра…» [9, 53].

Натуральнасць аўтарскага аповеду, нязмушаная плынь свядомасці вяртае чытача ў эпоху знакаміта-трагічнага скрыпача-віртуоза Нікола Паганіні, а яшчэ са старонак кнігі А. Вінаградава «Аповесць пра братоў Тургеневых. Асуджэнне Паганіні» прамаўляе эпоха Пушкіна, эпоха дзекабрыстаў.

Відаць, кніга захапіла эсэіста так моцна, што размова пра гістарычныя падзеі і трагедыйнасць быцця вялікіх талентаў ва ўсе часы, эпохі вядзецца на працягу аж двух раздзелаў. Янка Сіпакоў уражаны не толькі выключнай геніяльнасцю Паганіні, Моцарта, Пушкіна, неверагоднай ахвярнасцю жонак дзекабрыстаў. Ён абураны тупой няўдзячнасцю самой эпохі да спраў, да памяці Геніяў. Пры жыцці ім зайздросцяць і ненавідзяць. Пасля смерці – абыякавасць і бяспамяцтва. Толькі праз 56 гадоў Папа Рымскі дасць дазвол сыну аддаць цела майстра роднай зямлі. Не было каму пахаваць і слыннага кампазітара Моцарта. Яго цела магільшчык спіхнуў у агульную яму для беднякоў. Свой боль, пратэст і абурэнне аўтар эсэ выкажа двума кароткімі сказамі. Кожны з іх займае сваю (аўтаномную) прастору:

«Спіхнуў Маэстра!

Генія» [10, 83].

З успамінаў Александра Іванавіча Тургенева пра пахаванне Пушкіна аўтар эсэ цытуе даволі аб’ёмны ўрывак. Асабліва ўражаны наш сучаснік апошнімі словамі Тургенева – «<…> і гадзін у 7 раніцы апусцілі яго ў зямлю»... Абурэнню няма мяжы. Кожнае слова беларускага эсэіста – гэта бязлітасны вырак той гістарычнай несправядлівасці: «І ніхто? І ні слова? Моўчкі?

Божа, няўжо толькі такое пахаванне заслужыў самы найвялікшы паэт Расіі?!» [10, 85].

Спрабуе пісьменнік разабрацца і ў сутнасці таго, што адбылося 14 снежня 1825 года на Сенацкай плошчы. Праўда, тут жа спыніць самога сябе, даючы свайму чытачу чарговы ўрок мудрай павагі і тактоўнага стаўлення да гістарычных удач і памылак, актаў высокай духоўнасці і трагічнай асуджанасці: «Прабачце мне за гэтую эмацыянальную рэфлексію. Вядома ж, лёгка рэфлексаваць праз дзвесце гадоў пра тое, што адбылося ў той, незнаёмы табе час. А жыві ты тады... столькі нечаканасцей з’яўляецца! Як ва ўсім і заўсёды» [10, 85].

Найбольшай нечаканасцю для Сіпакова-пісьменніка быў лёс жанчын-дзекабрыстак. Асабліва ўразіў характар, натура, жыццёвыя прынцыпы Наталлі Дзмітрыеўны Фанвізінай з роду Апухціных. Менавіта яе ўсе лічылі прататыпам Таццяны Ларынай. Не адмаўляла гэтага і сама Фанвізіна. Кожны яе крок – учынак.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Ва ўсіх перыпетыях лёсаў дзекабрыстаў Я. Сіпакоў бачыць найперш багацце матэрыялу, якога «хапіла б на другі ў свеце геніяльны шэдэўр рускай літаратуры, які б стаў упоравень з «Вайной і мірам» Л. М. Талстога» [10, 85].

У заключэнне застаецца дадаць, што асэнсаванне Я. Сіпаковым праблемы асваення беларусамі вяршынных набыткаў сусветнай культуры акрэсліла і адваротны бок гэтай праблемы – а які ж унёсак беларусаў ў сусветную культурна-творчую прастору? Каб пераканаць свайго чытача ў значнасці таго, што далі беларусы свету, аўтар прыгадае свае эсэ пра Судзілоўскага, Уласіка, Дамейку, Алфёрава, Пякарскага, заметкі пра мастакоў-жывапісцаў, якія ўвасобілі ў сваіх творах ХХ стагоддзе, – М. Шагал, М. Савіцкі, М. Селяшчук, Я. Батальёнак, Л. Шчамялёў, Я. Драздовіч, Ф. Рушчыц, В. Бялыніцкі-Біруля, А. Марачкін і іншыя. Як бачым, зусім апраўданым успрымаецца галоўны вывад-абагульненне апавядальніка ў эсэ «Мая бібліятэка»: «Як хораша беларусы дапамагалі свету жыць і радавацца жыццю!» [9, 77].

Эсэ “Мая бібліятэка” – твор маштабны па значнасці думак і ахопу прасторава-часавага быцця “вялікіх кніг”, прысутнасці іх аўтараў у духоўнай культуры чалавецтва. Аўтар так падае, “прачытвае” найбагацейшы мастацкі матэрыял праз спасціжэнне асаблівасцей яго функцыянавання, што міжволі ўзнікае адчуванне не толькі значнасці Кнігі ў жыцці людскім, але і пагляднасці ўсяго, што пакідаюць у спадчыну пакаленням беларускія пісьменнікі 60-х гадоў ХХ стагоддзя.

Літаратура


1. Сіпакоў, Я. «Гэта ж якая радасць – ствараць жыццё!»: гутарку вёў З. Прыгодзіч // Полымя. – 2007. – № 2. – С. 176–198.

2. З Янкам Сіпаковым гутарыць Людміла Рублеўская // Крыніца. – 1997. – № 5. – С. 66– 72.

3. Гілевіч, Н. Збор твораў: у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск: ТДА «Пантограф», 2010. – Т. 15: Проза. Нататкі розных гадоў. З блізкіх і далёкіх дарог. Забаўныя гісторыі. – 606 с.

4. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 2: Проза. – С. 340 –413.

5. Сіпакоў, Я. Мая бібліятэка: кніга пра кнігі. Паліца другая. Аўтографы / Я.Сіпакоў // Полымя. – 2012. – № 2. – С. 66–90.

6. Акудовіч, В. Дыскурс свабоды: эсэ пра эсэ / В. Акудовіч // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 11 верасня. – С. 6–7.

7. Сіпакоў, Я. Мая бібліятэка: кніга пра кнігі: эсэ / Я.Сіпакоў // Маладосць. – 2011. – № 1. – С. 79–92.

8. Арнаудов, М. Психология литературного творчества / М. Арнаудов. – М.: Прогресс, 1970. – 654 с.

9. Сіпакоў, Я. Мая бібліятэка: кніга пра кнігі: эсэ / Я.Сіпакоў // Маладосць. – 2011. – № 2. – С. 45–88.

10. Сіпакоў, Я. Мая бібліятэка: кніга пра кнігі: эсэ / Я.Сіпакоў // Маладосць. – 2011. – № 3. – С. 77–96.


МГПУ им. И.П.Шамякина